УДК 378.1:947.6

М. Я. Сяменчык, дацэнт

# ПАЛІТЫЧНАЕ ІНФАРМАВАННЕ ЯК ЭЛЕМЕНТ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ

The article dwells upon political information as an element of pedagogical process.

Сіла ўздзеяння жывога слова на чалавека заўважана даўно, асабліва калі гэта слова закранае яго патрыятычныя і грамадзянскія пачуцці, калі яно сказана аўтарытэтнай асобай, своечасова, у пэўнай танальнасці. Асаблівую пашану мелі аратары, якія карысталіся мінімумам слоў, аднак дасягалі патрэбнага выніку. Але нават ва ўмовах павышэння агульнага адукацыйнага ўзроўню людзей, пры наяўнасці сістэмы друку, радыё, тэлебачання і г. д. іх патрэба ў інфармацыі аб навінах у свеце і іх краінах толькі ўзрастала. Гэта патрэба набыла глабальны характар, за выключэннем, бадай, тых грамадстваў, якія знаходзіліся на невысокай стадыі развіцця або існавалі ва ўмовах таталітарнага рэжыму. Савецкія грамадзяне па вядомых прычынах не мелі шырокіх магчымасцяў у атрыманні аб'ектыўнай інфармацыі, асабліва палітычнага характару. Партыйна-дзяржаўныя дзеячы ўсведамлялі небяспеку распаўсюджвання ў СССР буржуазнай ідэалогіі, заснаванай на антыкамунізме і антысаветызме, і таму імкнуліся запоўніць штучна створаны «жалезнай завесай» інфармацыйны вакуум адпаведнымі тэндэнцыйнымі паведамленнямі, якія ўслаўлялі савецкі лад. Іх паступленне да слухача (часта, нават без яго жадання) адбывалася цэнтралізавана, у адпаведнай ідэйнай інтэрпрэтацыі, праз усе магчымыя сродкі. Пра вынікі такога інфармавання доўга гаварыць не даводзіцца, а таксама аб тым, што здарылася з СССР, з марксізмам-ленінізмам як «найвялікшым дасягненнем навуковай думкі». Разам з імі выявілі сваю недасканаласць панаваўшыя метады і формы ідэйнай апрацоўкі насельніцтва.

Працяглы час пасля страты палітычнай манаполіі КПСС і нават пасля ўзнікнення суверэннай Рэспублікі Беларусь наша грамадства не адчувала патрэбы ў новай ідэалогіі. Асноўная ўвага тэарэтыкаў-грамадазнаўцаў скіроўвалася на вырашэнне палітычных і эканамічных праблем. Так, 11–12 снежня 1997 г. на Міжнароднай канферэнцыі палітолагаў, сацыёлагаў і эканамістаў у Мінску ідэалагічныя аспекты нават не прыгадваліся [1]. Мала таго, нават у 2003 г., па словах А. Р. Лукашэнка, самі словы «ідэалогія» і «ідэалагічная работа» выклікалі ў многіх алергію [2]. Сітуацыя стала змяняцца да лепшага, калі ідэалогія беларускай дзяржавы ва ўяўленні грамадзян стала набіраць рэальныя абрысы, у тым ліку з дапамогай інфармацыйных гадзін. Найбольш падрыхтаванай у гэтым сэнсе аказалася сістэма адукацыі, якая ў многім запазычыла напрацоўкі савецкай школы, у тым ліку і ў выхаваўчай сферы. Як адзначалася ў метадычных рэкамендацыях Міністэрства адукацыі, разасланых 8 мая 2003 г. па навучальных установах рэспублікі, правядзенне азначаных гадзін ставіла на мэце «дапамагчы навучэнцам зарыентавацца ў патоку падзей, выпрацаваць сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю, адчуць уласную сацыяльную значнасць, асэнсавана ўдзельнічаць у грамадска-культурным жыцці навучальнай установы, горада, рэспублікі, адстойваць асабістыя інтарэсы з улікам уласнай сацыяльнай бяспекі».

Можна меркаваць, што на тым этапе інфармацыйныя гадзіны яшчэ неслі на сабе адбітак фармальнасці і зарганізаванасці да часу, калі жыццё запатрабавала грунтоўнага і сістэмнага ідэалагічнага выхавання. Натуральна, што ў такіх умовах загады Міністэрства адукацыі ад 16 снежня 2003 г. «Аб ідэалагічным суправаджэнні выхаваўчай работы» і 1 красавіка 2004 г. «Аб неадкладных захадах па арганізацыі ідэалагічнай працы ў вну», акрамя іншага, вымушалі выкладчыкаў карэнным чынам перагледзіць сваё стаўленне да азначанай працы. У першым пункце апошняга загаду ставілася задача ўдасканалення сістэмы інфармавання студэнтаў, вызначаліся час, формы і метады яго правядзення. Што датычыць непасрэдных выканаўцаў інфармавання, то асноўную іх частку павінны былі складаць выкладчыкі сацыяльна-гуманітарных кафедр, а таксама «відныя грамадскія і дзяржаўныя дзеячы».

Адмысловыя пункты загаду ўтрымлівалі канкрэтныя прадпісанні адносна зместу інфармавання, у тым ліку «па прапагандзе дзяржаўнай сімволікі, інстытута прэзідэнцтва і ролі асобы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у рашэнні агульнадзяржаўных задач як увасаблення адзінства, якое забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць краіны».

Відавочна, што асноўная маса інфармацыі ў студэнцкай аўдыторыі мусіла ў першую чаргу фарміраваць пазітыўны імідж А. Р. Лукашэнка як выбітнага дзяржаўнага дзеяча, з якім звязваліся ўсе палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, культурныя і іншыя дасягненні беларускага народа.

Другі блок ідэй, неабходных для ўкаранення ў свядомасць навучэнскай моладзі, быў разлічаны на працяглы час і ўбіраў у сабе «фарміраванне ў студэнтаў светапогляду, які адбівае ідэалы беларускага грамадства і дзяржавы, яго палітычны і эканамічны ўклад. Фарміраваць у кожнага студэнта выразнае ўяўленне аб сваёй

ролі і месцы ў рашэнні сацыяльна-эканамічных праблем краіны».

Такім чынам, на першапачатковым этапе арганізацыі ідэалагічнай работы ў вну адзін з яе напрамкаў мусіў увасобіцца, па-першае, у інфармаванні студэнтаў; па-другое, у яго ажыццяўленні сіламі выкладчыкаў гуманітарных кафедр; па-трэцяе, у напрамку фарміравання ў студэнтаў пазітыўнага іміджу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і канструктыўнага сацыяльна-палітычнага светапогляду.

Варта адзначыць, што названы загад не выклікаў асаблівай заклапочанасці ў тых лектараў, якім належала інфармаваць студэнцтва, галоўным чынам таму, што яны ў савецкі час прайшлі «добра адладжаную жыццём сістэму ідэалагічнай работы» [2] і ў новых умовах маглі выкарыстаць назапашаны вопыт. Разам з тым высветлілася, што дзейснасць інфармавання студэнтаў на сучасным этапе залежала ад многіх акалічнасцей, без уліку якіх гэта праца мела б фармальны характар і не дасягала запатрабаваных мэтаў.

Ёсць падставы меркаваць, што рэкамендаваныя Міністэрствам адукацыі «Асноўныя напрамкі выхаваўчай і ідэалагічнай работы» створаны на ўсебаковым навуковым аналізе здабыткаў і страт беларускага грамадства з часоў набыцця суверэнітэту і з улікам перспектыў утварэння саюзнай дзяржавы. Безумоўна, станоўчым момантам распрацаваных рэкамендацый з'яўляецца палажэнне, у адпаведнасці з якім «асновай ідэалагічнага выхавання студэнтаў ва універсітэце павінен у першую чаргу з'яўляцца вучэбны працэс». У гэтай сувязі адзначым, што любое, нават самае кампетэнтнае і кваліфікаванае інфармаванне не дасць патрэбнага ідэйна-выхаваўчага плёну, калі яно не будзе грунтавацца на адпаведнай навукова-тэарэтычнай базе студэнтаў. Таму лектар-інфарматар павінен перш за ўсё ўлічваць іх узрост і адукацыйны ўзровень. Вядома, ідэальны варыянт мае месца тады, калі студэнты ўжо засвоілі асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, асновы дзяржавы і права, гісторыі Беларусі, паліталогіі. Менавіта тады набыты студэнтамі тэарэтычны матэрыял дасць магчымасць асэнсавана ставіцца да пачутай інфармацыі. Што датычыць інфармавання студэнтаў I–II курсаў, уяўленні якіх аб навакольным сацыяльна-палітычным асяроддзі не выходзяць за межы школьнага курса «Чалавек. Грамадства. Дзяржава», то яго (інфармаванне) мэтазгодна даручаць выкладчыкам гісторыі Беларусі. Па-першае, прапануемы студэнтам матэрыял можа быць выкарыстаны на семінарскіх занятках па тэмах: «Беларусь на міжнароднай арэне», «Беларусь у перыяд правядзення рэформ (1985–2006 гг.)». У гэтай сувязі мае сэнс канспектаванне студэнтамі тэматычных матэрыялаў, занатоўка тэрмінаў, дат, прамоў палітычных дзеячаў.

Інфармаванне студэнтаў, якія вывучаюць паліталогію і ідэалогію беларускай дзяржавы, пры ўмелым падборы матэрыялаў і методыкі выкладання найбольш дзейснае, паколькі прадстаўляе ім магчымасць выкарыстання набытых ведаў для арыентацыі ў сферы палітыкі. Важна, каб студэнты ўспрымалі інфармаванне не як забаўляльную акцыю, а як частку вучэбна-выхаваўчага працэсу. У цэлым жа па прычыне ўзроставай, адукацыйнай, інтэлектуальнай і іншай неаднароднасцяў студэнцкай аўдыторыі напярэдадні інфармацыйных гадзін варта правесці яе кароткае тэставанне на прадмет выяўлення папулярных у моладзі сродкаў інфармацыі (тэле- і радыёканалы, Інтэрнет, газеты, часопісы) з тым, каб у сваёй далейшай працы зарыентаваць увагу студэнтаў на найбольш рэпрэзентацыйныя крыніцы. З дапамогай таго ж тэсты можна выявіць ступень даверу да розных сродкаў масавай інфармацыі, узровень палітычнай сацыялізацыі і кола палітычных інтарэсаў.

У далейшым у мэтах удасканалення зместу і метадаў інфармавання варта (2–3 разы на год) здзяйсняць маніторынг кожнай студэнцкай аўдыторыі.

Асноўная праблема ў арганізацыі інфармавання – падбор і сістэматызацыя адпаведных матэрыялаў. Існуючыя ў свеце журналісцкія крытэрыі адбору матэрыялаў (катастрофы, перавароты, жыццё бамонда, скандалы, валютныя аперацыі) не павінны вызначаць іх (матэрыялаў) змест у аўдыторыі. У нашых умовах найбольш аптымальным з'яўляецца падборка паведамленняў аб падзеях і памятных датах, якая ў максімальнай ступені адпавядае задачам ідэалагічнага выхавання, таму, зыходзячы са структуры ідэалогіі беларускай дзяржавы (светапоглядны кампанент, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь як прававая аснова, палітычная сістэма, эканамічная мадэль), варта скампанаваць матэрыялы ў адпаведныя блокі па наступных прыкметах: актуальнасць, грамадская значнасць, адпаведнасць агульначалавечым каштоўнасцям і менталітэту беларускага народа [3].

З другога боку, каб акцэнтаваць увагу на знешнепалітычным аспекце ідэалогіі беларускай дзяржавы, мэтазгодна вылучыць блокі інфармацыі пад назвамі «Беларусь у сусветнай супольнасці», «Беларусь на постсавецкай прасторы» і «Беларусь на шляху да саюзнай дзяржавы». Гэтыя і іншыя падыходы ў падборы інфармацыі могуць стаць вызначальнымі для куратараў і адказных за інфармаванне ў групах.

Як адзначаецца ў інструкцыйна-метадычных дакументах Міністэрства адукацыі, цэнтральная роля ў інфармаванні студэнтаў належыць выкладчыку. Мы згодны з думкай складальнікаў «Асноўных напрамкаў выхаваўчай і ідэалагічнай работы» ў тым, што «менавіта стаўленне выкладчыка да працы, высокі

прафесіяналізм спрыяюць фарміраванню пазітыўных настрояў у студэнцкім асяроддзі». Дададзім, што выкладчык-лектар па роду свайго прафесійнага абавязку не можа не быць ідэолагам. Мае рацыю Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, калі кажа, што «ідэалагічныя работнікі – выключна штучны тавар. Гэта павінен быць выключна адукаваны, харызматычны чалавек, у яго ад прыроды павінна быць прыроджанае пачуццё ідэалагічнага работніка. Гэты чалавек павінен быць беззапаветна адданы тым ідэям, якія ён нясе ў грамадства. Ён павінен у гэта вельмі моцна верыць. Тады і слухачы, да якіх ён звяртаецца, будуць яго разумець, падтрымліваць, верыць і ісці за ім...» [2]. Менавіта такім і павінен быць сучасны выкладчык. Мяркуем, такім ён і з'яўляецца.

Апошнім часам роля інфармацыі і інфармацыйных тэхналогій надзвычай узрасла. Існуюць прыкметы асобага, «інфармацыйнага грамадства». Узрастае інфармацыйны паток з-за мяжы [4]. Практычна не застаецца прасторы па-за ўздзеяннем радыё, прэсы і г. д. розных накірункаў. Нягледзячы на перавагу дзяржаўных СМІ ў нашай краіне, не ўсе яны спрыяюць фарміраванню вызначальных чалавечых і ідэалагічных якасцей. У ліпеньскім 2005 г. нумары «Беларускай думкі» адзін з вядучых грамадазнаўцаў Беларусі прафесар Т. Адула, звяртаючыся да праблем нацыянальнай культуры, указаў на сур'ёзныя пралікі ў тым беларускага тэлебачання і радыё [5].

Вядома, што і простая з выгляду інфармацыя можа несці ідэалагічную нагрузку. Нават паведамленні – аб'явы, рэклама – не толькі тавар, а і магчымасць палітычнай камунікацыі. Такім чынам, ад таго, хто будзе падбіраць, каменціраваць і распаўсюджваць інфармацыю ў значнай ступені будзе залежаць жыццядзейнасць грамадства і дзяржавы. Як вынікае з чарговага загаду Міністэрства адукацыі «Асноўныя напрамкі выхаваўчай і ідэалагічнай работы ў 2005/2006 навучальным годзе ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі», акрамя іншага, ставіцца задача «арганізацыі інфармацыйнай бяспекі студэнтаў». І невыпадкова, бо ва ўмовах знікнення біпалярнага сусвету народы адчуваюць моцны ўціск краін «залатога мільярда» [6].

Такім чынам, неабходнасць і мэтазгоднасць палітычнага інфармавання надзвычай актуалізуюцца зараз. Яны відавочныя настолькі, што не патрабуюць працяглага тлумачэння. Невыпадкова, што ў нашых сучасных умовах азначанаму інфармаванню надаецца пільная дзяржаўная ўвага як сродка ідэалагічнага выхавання. Натуральна, што ў студэнцкай аўдыторыі для гэтай мэты павінны быць створаны асаблівa спрыяльныя ўмовы: вызначаны адмысловы час, прызначаны пастаянны лектар з ліку выкладчыкаў грамадазнаўчых дысцыплін (пажадана з вопытам лектара-прапагандыста савецкіх часоў), прадстаўлены ідэалагічнымі цэнтрамі (вну або адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай) абавязковы пакет матэрыялаў за папярэдні тыдзень, наладжаны пастаянны маніторынг аб дзейснасці інфармавання. У цэлым гэта праца патрабуе пастаяннай увагі і ўдасканалення, адпаведна палітычным працэсам у нашым грамадстве, на постсавецкай прасторы і ў сусветнай супольнасці. Заўважым, што характар і маштабы гэтых працэсаў у самым недалёкім часе будуць вызначацца сённяшней моладдзю.

### Літаратура


1. Власть и жизнь: Междунар. науч. конференция «Политический и социально-экономический процесс в Беларуси: состояние, проблемы, перспективы». – Минск, 1998. – 348 с.
2. Советская Белоруссия. – 2003. – 28 марта.
3. Настаўніцкая газета. – 2004 – 17 жніўня.
4. Марков, М. Информационные технологии и политические процессы / М. Марков // Беларуская думка. – 2005. – № 10. – С. 44.
5. Адула, Т. Захаванне нацыянальнай культуры / Т. Адула // Беларуская думка. – 2005. – № 7. – С. 23.
6. Бутранец, В. Роля ідэалогіі ў інфармацыйным проціборстве ў XXI стагоддзі / В. Бутранец // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 9. – С. 5.